# ВОДГУК

## на аўтарэферат дысертацыі Пышкала Кацярыны Рыгораўны «Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861)», прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02. – айчынная гісторыя

Дысертацыя К. Р. Пышкала выканана ў важным і актуальным на сёння для беларускай гістарыяграфіі праблемным полі сацыяльнай гісторыі. Для гэтага напрамку характэрна ўвага да розных груп і катэгорый насельніцтва, якія па тых ці іншых прычынах былі пазбаўлены ўласнага голасу ў традыцыйным гістарычным наратыве. У дадзеным выпадку ўвагу даследчыцы прыцягнула катэгорыя, маргіналізаваная як бы двойчы – як дзеці (што асабліва актуальна прыкладна да сярэдзіны XIX ст.) і як сіроты. Шэраг беларускіх гісторыкаў у апошнія гады ўжо звяртаўся да падобнай тэматыкі, але важнасць дысертацыі ў тым, што яна ўпершыню прапануе комплексны падыход да даследавання праблемы. Суіскальніца вучонай ступені надала асноўную ўвагу сістэме апекі над дзецьмі-сіротамі ў перыяд 1772–1861 гг., прадставіўшы яе ў адпаведнасці з саслоўнай структурай.

Вынікі даследавання дазваляюць глыбей ацаніць сістэму грамадскіх адносін і дзейнасць дзяржаўных устаноў на тэрыторыі Беларусі ў дадзены перыяд. Апека над сіротамі і развіццё падыходаў і практык дапамогі тым, хто апынуўся ў нястачы, можа служыць своеасаблівым маркерам сацыяльнай чуласці грамадства і дзяржавы ў вывучаемы перыяд. Акрамя таго, напрацоўкі дысертацыі ствараюць перадумовы для далейшых даследаванняў паўсядзённага жыцця дзяцей і падлеткаў у Беларусі. У ёй раскрыта роля саслоўных інстытуцый (дваранскіх апек і сіроцкіх судоў) апекі над сіротамі – дваранамі і гарадскімі абывацелямі, вызначана спецыфіка развіцця апекі ў саслоўях духавенства і сельскіх абывацеляў. У навуковы зварот уведзена шырокае кола гістарычных крыніц, што дазволіла ўсталяваць асаблівасці прававой рэгламентацыі апекі над дзецьмі-сіротамі розных саслоўяў і на канкрэтным гістарычным матэрыяле вызначыць сталыя практыкі, ініцыятывы і адметныя рысы апекі ў асноўных стратах грамадства пяці губерняў на тэрыторыі Беларусі.

Агульнае ўражанне аб даследаванні К. Р. Пышкала, атрыманае на падставе зместу аўтарэферату, станоўчае. Дысертацыя ўяўляе сабою самастойнае, завершанае даследаванне, мэта і задачы якога вызначылі яго ўнутраную структуру і адпавядаюць зробленым высновам і палажэнням, якія выносяцца на абарону.

Па тэме даследавання суіскальнікам апублікавана 13 навуковых артыкулаў, 4 з якіх з'яўляюцца артыкуламі ў навуковых часопісах і зборніках,

рэкамендаваных ВАК РБ. Акрамя таго, матэрыялы дысертацыі прайшлі апрабацыю ў шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый у Рэспубліцы Беларусь (саіскальнікам было прачытана 14 дакладаў).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць скарыстаны пры напісанні абагульняючых навуковых прац, пры распрацоўцы курсаў лекцый, падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў (па навучальных дысцыплінах «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»), пры арганізацыі экскурсійнай і музейна-экспазіцыйнай дзейнасці. Трэба адзначыць, што вынікі даследавання ўкаранёны ў навучальны працэс УА Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі» (Акт укаранення № 1 ад 19.12.2025).

На падставе зместу аўтарэферата можна зрабіць выснову, што дысертацыйнае даследаванне выканана на высокім навуковым узроўні, а яго аўтар К. Р. Пышкала заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Даю згоду на размяшчэнне водгуку на аўтарэферат дысертацыі на сайце ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі».

Кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А. М. Бяляўскі

23.02.2026

БГУ
Исторический факультет
ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ:
Т.В. Писобская